***Шылава А. С.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій факультэта кіравання і прафесійнага развіцця педагогаў Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі;*
***Мурашка Н. У.**, магістрант.*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

# Спецыфіка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў сродкамі фальклору

Праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў і інтэнсіўных адукацыйных тэхналогій, якія спрыяюць эфектыўнаму засваенню ведаў, фарміраванню вучэбнай дзейнасці малодшых школьнікаў і забяспечваюць дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.

The problem of formation of communicative competence at the 1st stage of General secondary education causes the need to find and implement new approaches and intensive educational technologies that contribute to the effective assimilation of knowledge and ensure the achievement of pre-designed results based on the interaction of actors, as well as the formation of educational activities of younger students.

**Ключавыя словы:** маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, этапы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, методыка вывучэння ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

**Keywords:** speech and communication competence, stages of formation of speech and communication competence, methods of studying the level of formation of speech and communication competence.

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы. Гэта звязана з мадэрнізацыяй адукацыйнага працэсу І ступені агульнай сярэдняй адукацыі на аснове кампетэнтнаснага падыходу.

*Кампетэнтнасны падыход* у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў пра мову развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Прымяненне *кампетэнтнаснага падыходу* на вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» здольна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў элементаў ключавых кампетэнцый, неабходных для выкарыстання вынікаў навучання ў сацыяльным жыцці, развіцця і сацыяльнай адаптацыі.

Згодна з вучэбнай праграмай па вучэбных прадметах «Беларуская мова» і «Літаратурнае чытанне» для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання *маўленча-камунікатыўная* кампетэнцыя з'яўляецца часткай кампетэнтнаснага падыходу па навучанню беларускай мове і літаратурнаму чытанню і ўключае:

– валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці;
– фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін;
– уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі;
– развіццё вобразнага ўяўлення, маўленчай актыўнасці, здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры;
– фарміраванне агульнавучэбных уменняў працы з тэкставай інфармацыяй розных відаў [1].

Разгледзім працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі.

Малодшы школьны ўзрост з'яўляецца аптымальным перыядам для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі. З паступленнем

у школу дзіця адкрывае для сябе новае месца ў сацыяльнай прасторы, акрамя таго адбываецца перагляд яго адносін з людзьмі. Школа, у сваю чаргу, прад'яўляе да дзіцяці новыя патрабаванні ў дачыненні да моўнага развіцця.

З першых дзён знаходжання ў школе яно ўключаецца ў працэс узаемадзеяння з аднакласнікамі і настаўнікам.

Важная роля ў працэсе ўзаемадзеяння паміж дзецьмі ў малодшым школьным узросце адводзіцца настаўніку, бо ён непасрэдна спрыяе гэтаму працэсу. Неабходна памятаць, што ў гэтым узросце мэты дзейнасці задаюцца дзецям пераважна з боку дарослых. Настаўнікі і бацькі вызначаюць, што можна і што нельга рабіць, якія заданні выконваць, якім падпарадкоўвацца правілам і г. д. Л. У. Выгоцкі ў сваіх працах так фармулюе гэты працэс: «Новыя паводзіны ўзнікаюць спачатку ў сумеснай дзейнасці з дарослым, які дае дзіцяці сродкі арганізацыі такіх паводзін, і толькі потым яны становяцца ўласным яго індывідуальным спосабам дзеяння» [2, с. 87].

Працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў I–IV класаў таксама мае сваю спецыфіку, і яго паспяховасць і эфектыўнасць залежаць ад шэрагу фактараў (гл. мал.):

- уліку ўзроставых асаблівасцей, характэрных для зносін у малодшым школьным узросце;
- выкарыстання відаў дзейнасці, характэрных для дадзенага перыяду, напрыклад, вучэбнай і гульнявой, з паступовым ускладненнем вербальных і невербальных сродкаў камунікацыі. Нягледзячы на тое што вядучым відам дзейнасці ў гэтым узросце з'яўляецца вучэбная дзейнасць, дзеці яшчэ не страцілі цікавасці да гульні і, што самае важнае, гульню яны выкарыстоўваюць для адпрацоўкі вучэбных уменняў. Такім чынам, гульню можна з поспехам выкарыстоўваць і для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі;
- накіраванасці працы настаўніка на фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі: ад ведаў аб прыёмах і правілах вербальных зносін і здольнасці разумець да выкарыстання на практыцы невербальных сродкаў зносін;
- атмасферы, у якой адбываецца працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі і ад якой шмат у чым залежыць эфектыўнасць гэтага працэсу.

Гаворачы пра атмасферу, у якой адбываецца працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, трэба памятаць, што ў малодшым школьным узросце для эфектыўнасці і паспяховасці любога працэсу патрэбна стварыць шэраг умоў:

1) дзейнасць павінна выклікаць у вучняў станоўчыя эмоцыі, задавальненне: адчуванне пачуцця радаснага задавальнення ад таго, што выконваецца, спрыяе ўзнікненню імкнення па ўласнай ініцыятыве, без прымусу ажыццяўляць гэтую дзейнасць;

2) дзейнасць павінна быць па магчымасці творчай;




*Малюнак* — Спецыфіка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі

3) арганізаваць дзейнасць вучня трэба так, каб ён імкнуся да мэты, якая нязначна пераўзыходзіць яго магчымасці і ўжо дасягнуты ім узровень выканання дзейнасці;

4) неабходна стымуляваць дзейнасць: адной з форм стымуляцыі патрэбы ў моўных зносінах з'яўляецца пахвала як станоўчае падмацаванне дасягненняў дзіцяці і стварэнне сітуацыі поспеху (распавядаць пра дасягненні вучня ў яго прысутнасці іншым педагогам і яго бацькам).

Рашэнне праблемы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў уяўляе сабой рэалізацыю наступных задач, заснаваных на падыходзе І. Я. Лернера да паняцця зместу адукацыі:

- фарміраванне сістэмы ведаў аб выкарыстанні беларускай мовы ў розных сітуацыях зносін;
- фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў, а таксама спосабаў ажыццяўлення дзейнасці ў знаёмай сітуацыі;
- фарміраванне вопыту прымянення практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач у нестандартнай сітуацыі (фарміраванне вопыту творчай дзейнасці);
- фарміраванне маўленчай актыўнасці і каштоўнасных адносін да беларускай мовы і маўленчай культуры, а таксама да традыцыйнай культуры.

Усе пералічаныя кампаненты звязаны паміж сабой: сфарміраваныя ўменні і навыкі, спосабы дзейнасці ў вучняў I–IV класаў без ведаў немагчымыя; творчая дзейнасць ажыццяўляецца на аснове пэўных ведаў, уменняў, навыкаў і засвоеных спосабаў дзейнасці; каштоўнасныя адносіны да роднай мовы і беларускай культуры, выхаванасць навучэнцаў прадугледжваюць веданне той рэчаіснасці, у якой устанаўліваюцца адносіны, што выклікаюць тыя ці іншыя эмоцыі ў вучняў I–IV класаў, а таксама прадугледжваюць іх паводзінавыя ўменні і навыкі.

У сувязі з гэтым у працэсе фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі можна вылучыць некалькі этапаў (табліца 1):

– развіццё слоўнікавага запасу;
– фарміраванне звязанага маўлення;
– фарміраванне камунікатыўных уменняў.

*Табліца 1* — Этапы фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў

| Этап | Запланаваны вынік | Фальклорны матэрыял | Метадычныя прыёмы |
|---|---|---|---|
| Развіццё слоўнікавага запасу | Правільны пераклад і разуменне значэння слова, падбор азначэнняў яго паняцця, уменне падбіраць сінонімы і антонімы да слова | Малыя жанры вуснай народнай творчасці (загадкі, прыказкі, прымаўкі, пацешкі, небыліцы і г. д.) | Вучэнне на памяць, практыкаванні па пашырэнні слоўнікавага запасу, узаемныя дыктоўкі, спаборніцтвы, гульні з малымі формамі |
| Фарміраванне звязанага маўлення | Уменне паслядоўна і дакладна будаваць вуснае апавяданне ці пераказ, правільная пабудова сказаў, адсутнасць падказак настаўніка ў час вуснага апавядання або пераказу | Творы вуснай народнай творчасці (скорагаворкі, казкі, міфы, легенды, паданні і г. д.), цацкі, гульні | Пастаноўка пытанняў, вусныя і пісьмовыя пераказы, вучэнне на памяць, гульні з цацкамі, скорагаворкамі, прыказкамі, прымаўкамі, чытанне, сачыненне казак і легенд вучнямі, драматызацыя, творчая выяўленчая праца |
| Фарміраванне камунікатыўных уменняў | Уменні слухаць і разумець гаворку, паслядоўна выказваць свае думкі, весці дыялог, карыстацца формамі моўнага этыкету | Святы і абрады, гульні, цацкі, творы вуснай народнай творчасці | Гульні, драматызацыі, расповеды-паказы, батлеечны тэатр, творчая праца |

На этапе ***развіцця слоўнікавага запасу*** неабходна прывесці школьнікаў да разумення значэння слоў, уяўленняў аб тым, што азначае дадзенае слова і ў якіх сітуацыях яго магчыма ўжываць, г. зн. да ведання азначэнняў паняцця слова, падбору сінонімаў і антонімаў да слова. Для такой працы падыходзяць малыя жанры вуснай народнай творчасці: пацешкі, скорагаворкі, лічылкі, прыказкі і прымаўкі, загадкі і інш. Праца настаўніка з малымі жанрамі вуснай народнай творчасці можа насіць фрагментарны, але ў той жа час сістэматычны характар. Прыказкі і прымаўкі, загадкі, скорагаворкі, пацешкі і небыліцы тым і добрыя для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, што яны лёгка, натуральна, у гульнявой форме развіваюць вербальнаю камунікацыю. Формы работы могуць быць наступнымі: вучэнне на памяць, практыкаванні па пашырэнні слоўнікавага запасу, узаемныя дыктоўкі, спаборніцтвы, гульні з малымі формамі, праца па высвятленні значэння незразумелых слоў, практыкаванні па пастаноўцы маўлення, фарміраванні ўмення ставіць пытанні і інш.

На этапе ***фарміравання звязнага маўлення*** неабходна навучыць вучняў прыгожа гаварыць, правільна будаваць сказы, вучыць паслядоўна і дакладна будаваць апавяданне ці пераказ. Для працы на гэтым этапе падыходзяць творы вуснай народнай творчасці. Праца настаўніка з творамі вуснай народнай творчасці можа быць наступнай:

- *чытанне*. Вучні I–IV класаў лепш успрымаюць праз выразнае чытанне настаўніка, не менш важна і навучыць дзяцей выразна чытаць;
- *разбор і абмеркаванне*. Пасля кожнай прачытанай казкі, легенды, быліны і г. д. неабходна ставіць шэраг пытанняў аб прачытаным, разам спрабаваць аналізаваць, задумвацца аб сумленнасці, добразычлівасці або, наадварот, аб подласці яе герояў. Калі сюжэт казкі будзе зразумелы вучням, неабходна вызначыць яго сувязь з рэальнымі жыццёвымі сітуацыямі;
- *драматызацыя*. Інсцэніроўка казак, легенд, былін і г. д. дапамагае паказваць казачныя характары, развіваць маўленне і творчыя здольнасці дзяцей. Такая работа згуртоўвае калектыў, дае магчымасць кожнаму дзіцяці ўнесці свой уклад у агульную справу;
- *сачыненне казак і легенд вучнямі*. Як правіла, у прыдуманых вучнямі казках і легендах адлюстроўваецца іх мара аб тым, каб не было бедных, злых; асуджаецца прагнасць, баязлівасць, жорсткасць, праслаўляецца дабрыня, працавітасць, подзвігі моцных і смелых людзей. Такая праца спрыяе развіццю мовы і маўлення;
- *творчая выяўленчая праца* (маляванне, лепка з пластыліну і г. д.). Вучні самі выбіраюць герояў і сюжэты, фантазіруюць і малююць, яшчэ раз перажываючы і аналізуючы ў сваім уяўленні тыя сітуацыі, у якіх гэтыя героі знаходзіліся.

На этапе ***фарміравання камунікатыўных уменняў*** мы павінны падысці да таго, што вучань слухае і разумее гаворку, паслядоўна выказвае свае думкі, карыстаецца формамі моўнага этыкету, вядзе дыялог. У працэсе фарміравання камунікатыўных уменняў можна выкарыстоўваць усе формы працы з творамі вуснай народнай творчасці, якія апісаны намі вышэй, а таксама народныя традыцыі і абрады. Праца з фальклорным матэрыялам можа ўяўляць сабой:

- *разбор і абмеркаванне*. Работа з абрадам заўсёды пачынаецца са знаёмства з ім, абмеркавання і аналізу яго значэння;
- *драматызацыю*. Інсцэніроўка абрадаў або іх фрагментаў дапамагае развіваць маўленне і творчыя здольнасці дзяцей, развівае ўменне працаваць у групах, разам;
- *расповед-паказ*. Пазакласнае мерапрыемства для бацькоў, дзе дзеці разам з настаўнікам аднаўляюць, расказваюць і паказваюць які-небудзь абрад;
- *творчую працу*. Маляванне, падрыхтоўка праектаў самастойна або з бацькамі;

• *квэст.* Правядзенне гульні з інтэрактыўнымі, спаборніцкімі, інтэлектуальнымі заданнямі на тэму беларускіх народных святаў і абрадаў.

Выніковасць прымянення на ўроках фальклорнага матэрыялу для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вызначаецца шляхам выяўлення дынамікі ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў.

Для дыягностыкі ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў I–IV класаў мы прапануем выкарыстоўваць методыку вывучэння сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, створаную на аснове методыкі вывучэння ўзроўню маўленчага развіцця М. А. Паваляевай [3].

Методыка вывучэння ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў уяўляе сабой вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці:

– слоўнікавага запасу;
– звязнага маўлення;
– камунікатыўных уменняў.

Паказчыкі сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў прадстаўлены ў табліцы 2.

### Вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці слоўнікавага запасу

Метадычныя парады. Вучань выконвае чатыры заданні. Для кожнага задання асобна падлічваюцца балы, якія выстаўляюцца па прынцыпе: правільны адказ — 1 бал, няправільны — 0 балаў. Пасля выканання ўсіх чатырох заданняў падлічваецца агульная колькасць балаў. Адпаведнасць колькасці балаў узроўню сфарміраванасці слоўнікавага запасу прыведзена ніжэй у табліцы 3.

*Класіфікацыя паняццяў.* Настаўнік падбірае сумарна 30 малюнкаў на розныя тэмы, напрыклад з выявай гародніны, садавіны, жывёл, адзення, посуду, мэблі. Затым ён называе паняцце, якое абазначае групу малюнкаў, просіць вучня даць падрабязную характарыстыку паняцця, а затым адабраць адпаведныя малюнкі. Вышэйшая адзнака за выкананне дадзенага задання — 30 балаў.

*Падбор антонімаў.* Праводзіцца ў форме гульні «Скажы наадварот». Вучню прапануецца падабраць да названага слова супрацьлеглае па значэнні. Усяго прапануецца 10 слоў (напрыклад: высокі — нізкі, малады — стары, далёка — блізка, сум — радасць, стаяць — бегчы, чорны — белы, кароткі — доўгі, маленькі — вялікі, чыста — брудна, дзень — ноч). Вышэйшая адзнака за дадзенае заданне — 10 балаў.

*Падбор сінонімаў.* Праводзіцца ў форме гульні «Скажы па-іншаму». Вучню прапануецца падабраць да названага слова блізкае па значэнні. Усяго прапануецца 10 слоў (напрыклад: хмурны, вясёлы, стары, вялікі, баязлівы; ісці, бегчы, размаўляць, смяяцца, плакаць). Вышэйшая адзнака за дадзенае заданне — 10 балаў.

*Падбор азначэнняў* (характарыстык). Праводзіцца ў форме гульні ў словы. Вучню прапануецца

*Табліца 2* — Паказчыкі сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў

| Крытэрыі | Паказчыкі | | |
|---|---|---|---|
| | Нізкі ўзровень | Сярэдні ўзровень | Высокі ўзровень |
| Узровень сфарміраванасці слоўнікавага запасу | Не называе прадметы, не можа падабраць абагульняльныя словы, сінонімы, антонімы, а таксама характарыстыкі прадмета на беларускай мове. Мае патрэбу ў падказках настаўніка. Няправільна выкарыстоўвае лексіка-граматычнае значэнне слоў | Можа падабраць абагульняльныя словы, сінонімы, антонімы з памылкамі перакладу. Указвае характарыстыкі прадмета, зрэдку выкарыстоўваючы «русізмы». Дапускае памылкі ў лексіка-граматычным значэнні слоў | Хутка і лёгка падбірае абагульняльныя словы, сінонімы, антонімы. Указвае характарыстыкі прадмета. Не мае патрэбы ў падказках настаўніка. Выкарыстоўвае словы ў адпаведнасці з іх лексіка-граматычным значэннем |
| Узровень сфарміраванасці звязнага маўлення | Няправільна аднаўляе тэкст, парушае структуру тэксту. Лексіка бедная, шматлікія паўзы. Мае неабходнасць у падказках настаўніка | Нязначна адхіляецца ад тэксту. Адсутнасць граматычных памылак, працяглых паўз. Невялікая колькасць падказак настаўніка | Правільнае аднаўленне тэксту. Выкарыстоўванне слоў у адпаведнасці з іх лексічным значэннем |
| Узровень сфарміраванасці камунікатыўных уменняў | Малагаварлівы ў зносінах, рэдка карыстаецца формамі моўнага этыкету, не ўмее паслядоўна выкладаць свае думкі, дакладна перадаваць іх змест, не ўмее весці дыялог | Удзельнічае ў размове часцей па ініцыятыве іншых, слухае і разумее гаворку, умее карыстацца формамі моўнага этыкету, не заўсёды ўмее дамовіцца і весці дыялог | Актыўны ў зносінах, умее слухаць і разумець гаворку, будуе зносіны з улікам сітуацыі, ясна і паслядоўна выказвае свае думкі, карыстаецца формамі моўнага этыкету, вядзе дыялагічную размову |

прыдумаць да названага слова як мага больш азначэнняў. Прапануецца 10 слоў: талерка, канапа, дрэва, кот, чалавек, памідор, яблык, ружа, аловак, карова (напрыклад: талерка, якая яна? як пра яе можна сказаць яшчэ? якой яна можа быць?). Вышэйшая адзнака за дадзенае заданне — 10 балаў. 1 бал — прыдумана дзве і больш характарыстыкі да слова, 0 балаў — менш за два азначэнні альбо адказ не адпавядае значэнню слова, альбо вучань не можа падабраць азначэнні.

## Вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці звязнага маўлення вучняў

Метадычныя парады. Для вывучэння ўзроўню сфарміраванасці звязнага маўлення вучням прапануецца пераказаць невялікі па аб'ёме тэкст. Для гэтага яны павінны спачатку праслухаць незнаёмае апавяданне або казку, а затым зрабіць пераказ. Пераказы вучняў аналізуюцца па наступных паказчыках:

- правільнасць фармулёўкі асноўнай думкі;
- уменне паслядоўна і дакладна будаваць пераказ;
- паўната выкарыстання лексікі тэксту, ужыванне слова ў адпаведнасці з яго лексічным значэннем. Замена аўтарскіх выразных сродкаў уласнымі;
- правільнасць пабудовы сказаў, уменне выкарыстоўваць складаныя сказы;
- наяўнасць або адсутнасць падказак настаўніка ў час пераказу, неабходнасць паўторнага чытання тэксту;
- адсутнасць «русізмаў».

Кожны паказчык ацэньваецца асобна: 2 балы — правільнае аднаўленне тэксту, 1 бал — нязначныя адхіленні ад тэксту, адсутнасць граматычных памылак, працяглых паўз, невялікая колькасць падказак, дапускаецца невялікая колькасць русізмаў; 0 балаў — няправільнае аднаўленне, парушэнне структуры тэксту, беднасць лексікі, шматлікія паўзы, неабходнасць у падказках, вялікая колькасць русізмаў. Вышэйшая адзнака за пераказ тэксту — 12 балаў (табліца 3).

## Вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці камунікатыўных уменняў

Для вывучэння ўзроўню сфарміраванасці камунікатыўных уменняў вучняў можна выкарыстоўваць назіранне за іх свабоднымі зносінамі па методыцы М. А. Паваляевай. У сваёй методыцы аўтар у працэсе назірання звяртае ўвагу на характар зносін, ініцыятыўнасць, уменне ўступаць у дыялог, падтрымліваць і весці яго, слухаць суразмоўцу, разумець, ясна выказваць свае думкі. Ацэнка камунікатыўных уменняў праводзіцца з улікам наступных крытэрыяў:

- актыўнасць у зносінах (імкнецца да зносін па ўласным жаданні, з'яўляецца ініцыятарам зносін);
- уменне слухаць і разумець, аб чым ідзе гаворка;
- уменне будаваць зносіны з улікам сітуацыі;
- уменне весці дыялог;
- лёгкасць уваходжання ў кантакт з дзецьмі і дарослымі;
- яснасць і паслядоўнасць выказвання сваіх думак;
- выкарыстанне форм моўнага этыкету [3, с. 73].

Наяўнасць кожнага з крытэрыяў можа быць ацэнена настаўнікам у балах — ад 0 да 3 балаў. Вышэйшая адзнака — 21 бал (табліца 3).

Такім чынам, вызначаючы ўзровень сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў I–IV класаў з апорай на табліцу 3, неабходна кіравацца наступным прынцыпам: калі ўзровень двух крытэрыяў з трох адпавядае больш высокаму ўзроўню, то агульны ўзровень сфарміраванасці вызначаецца як больш высокі; калі ж два крытэрыі з трох адпавядаюць больш нізкаму ўзроўню, то агульны ўзровень сфарміраванасці вызначаецца як больш нізкі.

Такім чынам, спецыфіка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў I–IV класаў заключаецца ва ўзроставых асаблівасцях, у выкарыстанні розных відаў дзейнасці, характэрных для гэтага ўзросту, у стварэнні цікавых і творчых умоў для іх фарміравання і развіцця, а выкарыстанне для гэтага працэсу фальклорнага матэрыялу робіць яго больш натуральным, непрымусовым і займальным.

*Табліца 3* — Паказчыкі ўзроўню сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучняў I–IV класаў

| Крытэрыі ўзроўню сфарміраванасці | Узровень сфарміраванасці маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі | | |
|---|---|---|---|
| | Нізкі | Сярэдні | Высокі |
| Слоўнікавы запас | 0–30 | 31–50 | 51–60 |
| Звязнае маўленне | 0–5 | 6–9 | 10–12 |
| Камунікатыўныя ўменні | 0–9 | 10–16 | 17–21 |

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 4 класс / Министерство образования Республики Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2017. — 203 с.
2. *Выготский, Л. С.* Психология развития ребёнка / Л. С. Выготский. — М. : Эксмо, 2004. — Библиотека всемирной психологии. — 512 с.
3. *Поваляева, М. А.* Справочник логопеда / М. А. Поваляева. — Ростов н/Д. : Феникс, 2002. — 448 с.

*Матэрыял паступіў у рэдакцыю 14.01.2020*